УДК 81’243

Н.Я.Савіцкая, ст.выкл. (БДТУ, г. Мінск)

# ФАРМІРАВАННЕ НЕАБХОДНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ У СВЯДОМАСЦІ ЗАМЕЖНЫХ НАВУЧЭНЦАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ РУСКАЙ МОВЫ ЯК ЗАМЕЖНАЙ

Пры навучанні рускай мове як замежнай, як і любой іншай замежнай мове, важна ведаць, якія кампетэнцыі варта фарміраваць у свядомасці навучэнцаў.

Дакументам, дзе ў найбольш поўнай форме прадстаўлены кампетэнцыі, якія неабходна сфарміраваць у навучэнцаў, з’яўляецца манаграфія “Агульнаеўрапейскія кампетэнцыі валодання замежнай мовай: вывучэнне, выкладанне, ацэнка”, падрыхтаваная пры падтрымцы Дэпартамента па моўнай палітыцы Генеральнага дырэктарата па адукацыі, культуры, спадчыне, моладзі і спорце, выдадзеная ў Страсбургу ў 2001 г., перакладзеная на рускую мову спецыялістамі Маскоўскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта ў 2003 г. і перавыдадзная ў 2005 г. Гэтым дакументам пры навучанні замежным мовам кіруюцца ва ўсіх еўрапейскіх краінах, ў тым ліку ў Расіі і ў Беларусі.

Манаграфія знаёміць выкладчыка з сістэмай навучання замежным мовам і шасціўзроўневай сістэмай ацэнкі авалодання мовай. Тут таксама сфармуляваны асноўныя кампетэнцыі, якія неабходна фарміраваць ў працэсе навучання. Рэкамендацыі манаграфіі прапануюць аснову для распрацоўкі вучэбных праграм, экзаменацыйных матэрыялаў і інш. ў рамках агульнаеўрапейскай моўнай прасторы.Кампетэнцыі апісваюць, чым неабходна авалодаць навучэнцу замежай мовы, каб выкарыстоўваць яе ў мэтах зосін, якія веды і ўменні неабходна засвоіць, каб камунікацыя была паспяховай.

У манаграфіі выдзяляюцца агульныя і камунікатыўная моўныя кампетэнцыі. Агульныя кампетэнцыі ўключаюць веды, уменні, экзістэнцыяльную кампетэнцыю, а таксама здольнасць вучыцца. Камунікатыўная моўная кампетэнцыя ўключае: уласна лінгвістычную (лексічную, граматычную, семантычную, фаналагічную), сацыялінгвістычную, прагматычную.

У сваю чаргу, агульныя кампетэнцыі навучэнца ўключаюць дэкларатыўныя, сацыякультурныя і міжкультурныя веды.

Да прыкладу, сацыякультурныя веды ахопліваюць паўсядзённае жыццё (харчаванне, напоі, рабочы дзень, святы, захапленні і інш.), умовы жыцця, міжасобасныя адносіны, сістэму каштоўнасцей, правілы этыкету і інш.